3. *Дубова, М. В.* Компетентностные задачи как форма учебного материала / М. В. Дубова // Педагогика. 2012. № 1. С.46–52.

УПЛЫЎ СТЫЛЮ КАМУНІКАЦЫІ ВЫКЛАДЧЫКА НА НАВУЧАЛЬНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ І ЎЗРОВЕНЬ КАНФЛІКТНАСЦІ

К. В. Сугойдзь-Зубовіч

Адной з адметных асаблівасцей кожнага выкладчыка з'яўляецца стыль узаемаадносінаў, які педагог выкарыстоўвае ў працэсе выкладання і ў іншых відах камунікацыі са студэнтамі і калегамі. Навукоўцы В.А. Кан-Калік, Я. Л. Каламінскі, М.А. Беразовін і інш. вылучаюць некалькі асноўных стыляў: аўтарытарны, дэмакратычны, ліберальна-папусціцельскі. Іх параўнальная характарыстыка, складзеная на аснове [1; 2; 3], адлюстравана ў табліцы 1.

Табліца 1

Параўнальная характарыстыка асноўных стыляў камунікацыі

Крытэрый	Аўтарытарны	Дэмакратычны	Ліберальны
Пазіцыя выкладчыка	Сам вырашае ўсе пытанні, не ўлічваючы меркаванне навучэнцаў	Акцэнт на супрацоўніцтве выкладчыка са студэнтам	Выкладчык стараецца не ўмешвацца ў працу студэнтаў
Узровень ініцыятыўнасці студэнтаў	Ініцыятыва падаўляецца	Развіццё ініцыятывы	Самастойнасць студэнтаў, адсутнасць адказнасці за невыкананне заданняў
Ступень псіхалагічнага камфорту студэнтаў	Нізкая	Высокая	Сярэдняя
Сфера найбольш эфектыўнага прымянення	Лекцыі па прыродазнаўчых дысцыплінах	Гуманітарныя дысцыпліны, якія патрабуюць асабістага погляду	Калі студэнты адказна ставяцца да сваёй працы
Асноўныя спосабы ўзаемадзеяння выкладчыкаў са студэнтамі	Загад, указанне, інструкцыя, вымова	Просьба, парада, інфармаванне	Пераканнанне без дастатковай патрабавальнасці
Аўтарытэт выкладчыка	Фармальны аўтарытэт	Рэальны аўтарытэт; фармальны і нефармальны лідар	Няма дастатковага аўтарытэту

Падчас нашага даследвання было праведзена апытанне сярод выкладчыкаў ВНУ са стажам працы ад 1 да 54 год (24 чал.) і студэнтаў

1–4 курсаў (54 чал.). Вынікі паказалі, што выкладчыкі выкарыстоўваюць усе стылі адносінаў (табл. 2).

Таблица 2

Стыль адносінаў выкладчыкаў да студэнтаў

Стыль адносінаў	Думка выкладчыкаў, %	Думка студэнтаў, %
Аўтарытарны	12,5 %	27,8 %
Дэмакратычны	41,7 %	31,5 %
Сітуацыйны	29 %	29,6 %
Ліберальна-папусціцельскі і сітуацыйны	8,3 %	9,3 %
Дэмакратычны і сітуацыйны	8,3 %	

Каля 79 % выкладчыкаў і 70,3 % студэнтаў лічаць, што на поспехі студэнтаў моцна ўплывае стыль выкладання. 12,5 % педагогаў і 19,2 % навучэнцаў адзначаюць, што стыль выкладання не ўплывае або амаль не ўплывае на паспяховасць студэнта, яшчэ 4,4 % студэнтаў не вызначыліся з адказам на гэтае пытанне.

Больш за 58 % выкладчыкаў лічаць свой стыль выкладання найлепшым для таго, каб даць студэнту максімальны ўзровень ведаў. Прычым 40 % выкладчыкаў лічаць аўтарытарны стыль найлепшым для забеспячэння найбольшай паспяховасці студэнтаў, што падцвярджае іншыя даследванні [3], але эфектыўнасць аўтарытарнага стылю там была адзначана толькі для лекцыйных зняткаў па дакладных і прыродазнаўчых дысцыплінах. Абсалютная большасць удзельникаў нашага апытання выкладаюць гуманітарныя дысцыпліны, таму, відаць, толькі 40 % выкладчыкаў, якія аддалі перавагу аўтарытарнаму стылю, сапраўды прытрымливаюцца яго ў працэсе навучання, а астатнія 60 % адказаўшых выкарыстоўваюць дэмакратычны, сітуацыйны ці нават ліберальна-папусціцельскі стыль выкладання.

Стылі зносінаў, якія, паводле меркаванняў студэнтаў, найлепш падыходзяць для найбольш эфектыўнага навучання, размеркаваліся так: 31,5 % рэспандэнаў аддалі перавагу дэмакратычнаму стылю выкладання, 24 % – аўтарытарнаму, 44,4 % – сітуацыйнаму, 5,5 % – ліберальна-папусціцельскаму, 1,9 % – анархісцкаму.

Большасць з апытанных выкладчыкаў прызнаюцца, што канфлікты са студэнтамі ў іх здараюцца рэдка: каля 16,7 % выкладчыкаў лічаць, што канфлікты са студэнтамі ўзнікаюць у іх даволі часта. Была заўважана заканамернасць: канфлікты паміж студэнтамі і выкладчыкамі ўзнікаюць пераважна тады, калі выкладчык выбірае ў якасці адзінага або часта выкарыстоўвае аўтарытарны стыль выкладання.

Найбольш частай прычынай канфліктаў са студэнтамі выкладчыкі лічаць нежаданне апошніх вучыцца і нестараннасць навучэнцаў. Другое месца ў шэрагу прычын канфліктаў займаюць незацікаўленасць

студэнтаў навуковай дысцыплінай, якую чытае выкладчык, дрэнныя паводзіны і агульная нявыхаванасць студэнтаў. Частай прычынай канфліктаў з'яўляецца непавага студэнтаў, непаразуменне паміж выкладчыкам і студэнтам, існаванне розных меркаванняў ў выкладчыкаў і студэнтаў (у т.л. розная ідэалогія, розныя пункты гледжання наконт выкладаемай дысцыпліны). Іншымі канфліктнымі фактарамі, па меркаванні выкладчыкаў, з'яўляюцца асабістая непрыязнь паміж выкладчыкам і студэнтам і пропускі заняткаў студэнтамі.

Выкладчыкі, у якіх нячаста ўзнікаюць канфлікты са студэнтамі, вельмі часта тлумачаць гэта сваім міралюбівым характарам і абраным імі стылем выкладання (дэмакратычным або сітуатыўным). Некаторыя тлумачаць такую сітуацыю тым суб'ектыўным фактарам, што канфліктных студэнтаў няшмат (толькі 14,8 % апытаных намі навучэнцаў адказалі, што яны маюць частыя канфлікты з выкладчыкамі, а у 85,2 % канфлікты з выкладчыкамі рэдкія). Многія выкладчыкі лічаць, што для таго, каб не было канфліктаў, трэба звярнуць увагу на сам працэс навучання, у адносінах са студэнтамі канцэнтравацца толькі на вучобе, зрабіць заняткі якаснымі і цікавымі, сфармуляваць дакладныя патрабаванні да студэнтаў, падтрымліваць сувязь са студэнтамі, кансультуючы іх па розных пытаннях, выкарыстоўваць інавацыйныя тэхналогіі. Некаторыя выкладчыкі робяць акцэнт на падтрымцы асабістых адносінаў са студэнтамі і ўвазе да навучэнцаў як да асобы. Такія выкладчыкі раяць знайсці індывідуальны падыход да кожнага студэнта, аднолькава ставіцца да ўсіх навучэнцаў, паважаць іх і імкнуцца зразумець, у складанай сітуацыі паставіць сябе на месца студэнтаў, ніколі не парушаць мяжу ў адносінах «выкладчык-студэнт». Таксама эфектыўным спосабам прафілактыцы канфліктаў, з'яўляецца імкненне выкладчыкаў не абвастраць сітуацыю.

Вінаватым ў канфліктах 33 % студэнтаў лічаць выкладчыкаў, 13 % – студэнтаў, але большасць (51,9 %) лічыць, што ў канфліктах могуць быць вінаватыя як студэнт, так і выкладчык – абодва бакі адначасова.

Сярод прычын канфліктаў на першае месца студэнты паставілі недастатковыя прафесійныя якасці (13 %) выкладчыка і не выкананне ім сваіх прамых абавязкаў. Яшчэ 9,3 % студэнтаў лічаць прычынай канфліктаў неадэкватнасць выкладчыкаў; 9,3 % – неабаснаваныя патрабаванні да студэнтаў (у т.л. неадпаведнасць патрабаванняў таму аб'ёму ведаў, якія дае выкладчык); 3,7 % – «савецкія» (састарэлыя) метады выкладання; 3,7 % называюць прычынай канфлікта абыякавасць выкладчыкаў. Сярод прычынаў студэнты таксама назвалі адсутнасць індывідуальнага падыходу да навучэнцаў, адсутнасць зваротнай сувязі студэнта з выкладчыкам.

Значнае месца сярод прычын канфліктаў займаюць асабістыя крыўды студэнтаў на выкладчыкаў з-за нясправядлівай, на думку студэнтаў, ацэнкі іх ведаў і ігнаравання студэнтаў (20,4 % адказаў), асабістых якасцей выкладчыка, прыніжэння і знявагі студэнта, нядопуска студэнта да здачы залікаў/іспытаў, перадузятыя адносіны да навучэнцаў і наяўнасці ў выкладчыка «любімчыкаў», занадта вялікага «ўзвышэння» выкладчыкам свайго прадмета і завышанай самаацэнкі выкладчыка, парушэння правоў студэнтаў, прыдзірак выкладчыка да знешняга выгляду і асаблівасцяў маўлення студэнта. Выпадкі, калі студэнты з'яўляюцца пачынальнікамі канфліктаў, апытанныя тлумачаць такімі прычынамі, як нежаданне студэнтаў вучыцца (18,5 %), дрэнныя паводзіны і невыхаванасць студэнтаў (7,4 %), нагласць студэнтаў, пропуск заняткаў, залішняя самаўпэўненасць і максімалізм навучэнцаў, няўменне слухаць выкладчыка, а таксама тое, што студэнты патрабуюць выканання іхніх правоў, але забываюць пра свае абавязкі.

Апытаныя выдзяляюць шэраг выпадкаў, калі пачынальнікам канфлікта могуць стаць абодва – студэнт і выкладчык. Гэта адбываецца па такіх прычынах, як існаванне розных поглядаў у студэнта і выкладчыка, у т.л. ідэалагічных і рэлігійных (18,5 %), асабістая непрыязь студэнта і выкладчыка (6,7 %), непаразуменне (9,3 %), узаемная непавага (5,5 %), а таксама парушэнне субардынацыі (у т.л. сэксуальныя дамагацельствы да студэнтак).

Праведзенае намі даследванне не ўсталявала залежнасці паміж стылем выкладання, ступенню канфліктнасці выкладчыка са студэнтамі і стажам ягонай працы. Але было дакладна адзначана, што ад абранага выкладчыкам стыля ўзаемаадносінаў залежыць як эфектыўнасць навучання студэнтаў, так і магчымасць з'яўлення канфліктаў паміж выкладчыкам і студэнтамі. Найбольш «канфліктным» стылем выкладання, па выніках нашага апытання, з'яўляецца аўтарытарны. Ініцыятарам канфлікта падчас навучальнага працэсу могуць стаць як студэнт, так і выкладчык (або студэнт і выкладчык адначасова). Найбольш частымі прычынамі канфліктаў з'яўляюцца невыкананне адным з бакоў навучальнага працэсу сваіх абавязкаў, а таксама спрэчкі і непаразуменні асабістага характару.

Літаратура

1. *Бодалев А.А.* Психология общения: избр. психол. труды. М., Воронеж, 2002.
2. Основы педагогического мастерства / Под ред. И. А. Зязюна. М., 1989.
3. *Подкуйко М. С., Подкуйко Д. Н.* Стиль работы преподавателя и его влияние на качество учебно-образовательного процесса. [Электронный ресурс] / Режим доступа: http://www.rusnauka.com/20_PRNiT_2007/Pedagogica/23895.doc.htm. / Дата доступа: 25.04.2015.